**Список литературы:**

1. Белогурова, Л. М. Календарная традиция северного Поднепровья в восточнославянском контексте / Л. М. Белогурова // Вопросы этномузыкознания. – 2014. – № 7. – С. 68–87.
2. Гиппиус, Е. В. Проблемы ареального исследования традиционной русской песни в областях украинского и белорусского пограничья / Е. В. Гиппиус // Традиционное народное музыкальное искусство и современность (вопросы типологии) : сб. трудов. – М., 1982. – Вып. 60. – С. 6–11.
3. Дорохова, Е. А. Масленичные песни в русской календарной традиции / Е. А. Дорохова // Фольклорный текст: функция и структура: сб. трудов / Российская академия музыки им. Гнесиных ; отв. ред. и сост. М. А. Енговатова. – М., 1992. – Вып. 121. – С. 5–31.
4. Земцовский, И. И. Жанр, функция, система / И. И. Земцовский // Советская музыка. – 1971. – № 1. – С. 24-32.
5. Можейко, З. Я. Календарно-песенная культура Белоруссии. Опыт системно-типологического исследования / З. Я. Можейко // АН Белорусской ССР. Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; ред. Е. В. Гиппиус. – Минск : Наука и техника, 1985. – 247 с.
6. Народная традиционная культура Псковской области: обзор экспедиционных материалов / Фольклорно-этнографический центр, Комитет по культуре Псковской области, Областной центр народного творчества; сост., науч. ред. А. М. Мехнецов. – СПб., Псков : Издательство Областного центра народного творчества, 2002. – Т. 2. – 813 с.
7. Прыбылова, В. М. Музычны ландшафт песенна-абрадавых традыцый Масленіцы Верхнага Падняпроўя / В. М. Прыбылова ; навук. рэд. Т. С. Якіменка. – Мінск : БДАМ, 2010. – 151 с. – з дадаткам «Музычныя традыцыі Масленіцы Беларускага Падняпроўя» (кампакт-дыск).
8. Смоленский музыкально-этнографический сборник. Том. 1. Календарные обряды и песни / отв. ред. О. А. Пашина. – М. : Индрик, 2003. – 760 с.
9. Тавлай, Г. В. Белорусское купалье. Обряд, песня / Г. В. Тавлай. – Минск : Наука и техника, 1989. – 172 с.
10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : У 6 т. Т. 1. Віцебскае Падзвінне ; склад. Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.
11. Эвальд, З. В. Социальное переосмысление жнивных песен белорусского полесья / З. В. Эвальд // Песни Белорусского Полесья / АН СССР. Ин-т искусствоведения, этнографии и фольклора ; под ред. Е. В. Гиппиуса. – М. : Сов. композитор, 1979. – С. 15–32.

*Алена Грыбко*

## ВОПЫТ ДАСЛЕДАВАННЯ ФАЛЬКЛОРНАЙ ПЕСЕННАЙ ТРАДЫЦЫІ ВЁСКІ РЭДЗЬКАЎШЧЫНА ПАСТАЎСКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

*Elena Gribko*

## RESEARCH EXPERIENCE OF FOLK SONG TRADITION IN THE VILLAGE OF REDKAVSHCHYNA POSTAVY DISTRICT VITEBSK REGION

*Аўтар артыкула дзеліцца вопытам збору народных песень у вёсцы Рэдзькаўшчына, на Беларускім Падзвінні. У 2014-2016 гг. аўтар запісала шмат песень сямейна-абрадавага цыклу (асабліва вясельных) і шмат песень каляндарна-абрадавага цыклу (песні абраду Жаніцьба Цярэшкі, валачобныя песні).*

*The author shares her experience folk songs collecting in Redkavshchyna Village (historical-ethnographic region Belarusian Padzvinne). In 2014-2016 the author collected many songs of family ritual cycle (especially weddings) and many songs calendar ceremonial (songs of ritual Marriage Tereshka, Easter songs).*

У сучасным свеце хуткімі тэмпамі паскараецца працэс урбанізацыі, а вёскі, у тым ліку і беларускія, з іх самабытнай песеннай культурай імкліва знікаюць з геаграфічных мапаў і (што значна больш прыкра) з сацыяльнай і культурнай памяці народа. Вельмі балюча глядзець на тое, як выдатныя ўзоры песень паміраюць разам са старэйшым пакаленнем носьбітаў, чыё высокае мастацтва часам няма каму пераймаць.

Пачынаючы з 2014 года я займаюся зборам традыцыйных узораў песень, якія дагэтуль захаваліся ў вёсцы Рэдзькаўшчына Пастаўскага раёна. Яны адносяцца да розных жанраў. Большасць складаюць песні сямейна-абрадавага цыклу (асабліва вясельныя), а таксама песні каляндарна-абрадавага цыклу (абрад Жаніцьба Цярэшкі, валачобныя песні).

Спявачкі вёскі Рэдзькаўшчына родам з бліжэйшых мясцін, але пасля таго, як яны пайшлі замуж у гэтую вёску, заўсёды заставаліся актыўнымі ўдзельніцамі яе жыцця. Можна меркаваць, што сабраныя матэрыялы адносяцца не толькі да канкрэтнай мясцовасці, але і да наваколля. Пяркоўская Глафіра Пятроўна (1941 г.) з вёскі Губіна, Шкорнік Глафіра Віктараўна (1932 г.) з вёскі Луцк-Казлоўскі, Вештарт Ядзьвіга Уладзіміраўна (1936 г.) з вёскі Жуперкі, Цярлюк Часлава Цітаўна (1938 г.) з вёскі Анкуды, Ганчар Вера Фамінічна (1938 г.) з вёскі Сарокі, Гінько Гэлена Васільеўна (1925 г.) з вёскі Рэдзькаўшчына.

Запісам фальклору на Пастаўшчыне і яго вывучэннем займаліся такія вучоныя, як: Г.І. Цітовіч, П.В. Шэйн, А. Чэрны, З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева і іншыя. Аналізуючы працы фалькларыстаў і этнографаў, можна зрабіць вывад, што найменш трапілі ў апублікаваныя даследаванні ўзоры ўсходняй часткі Пастаўскага раёна. Таму актуальным, на наш погляд, застаецца даследаванне і захаванне культурнай спадчыны менавіта гэтага рэгіёна.

Пастаўскі раён знаходзіцца на паўночным захадзе Беларусі, так званым заходнім выступе Віцебскай вобласці. Тэрыторыя раёна займае часткова Полацкую нізіну па сярэднім цячэнні ракі Дзісна і Свянцянскія грады. Паазер'е ў сваёй заходняй зоне, - рэгіён скрыжавання розных веравызнанняў, культурных узаемаўплываў. Пераважная колькасць насельніцтва тут належыць да дзвюх асноўных хрысціянскіх канфесій: праваслаўя і каталіцызма [2, с. 25].

Вопыт даследвання паказвае шэраг сучасных адметнасцяў, якія яскрава бачныя на прыкладзе традыцыйных абрадаў і свят. Так, на Заходнім Паазер'і «польскія» калядоўшчыкі заходзілі не толькі да «сваіх» – католікаў, але і да

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

праваслаўных, і да стараабрадцаў, у якіх свята Нараджэння Хрыстова будзе святкавацца толькі праз два тыдні, а ў гэты час ідзе Піліпаўскі пост. Тым не менш іх прымалі, давалі падарункі – аказвалі павагу «людзям са свету». Гэты момант яскрава характарызуе сапраўднае добрасуседства людзей розных нацый і веравызнанняў на Беларусі [2, с. 27]. Зімовая гульня «Жаніцьба Цярэшкі» – адзін з самых яркіх «маркераў» тэрыторыі Паазер'я. Хоць арэал «Цярэшкі» ахоплівае таксама частку Цэнтральнай Беларусі, але гэта ўжо перыферыя арэала, межы «рассейвання» абрадавага дзейства. На Паазер'і «Цярэшку жэняць» паўсюдна на захад ад Полацка: ў заходняй частцы Полацкага, Расонскім, Лепельскім, Глыбоцкім, Пастаўскім, Міёрскім, Верхнядзвінскім, усходняй частцы Браслаўскага раёнах.

У Рэдзькаўшчыне гэты абрад праходзіў так: збіралася моладзь вечарам у якой-небудзь хаце. Ставілі стол, на стол хлопцы прыносілі гарэлку, дзяўчаты –якой-небудзь закускі, запрашалі музыкантаў. Многа людзей збіралася паглядзець на дзейства. Выбіралі «бацьку» і «маці», тыя спявалі: «Пайду я гарой-гарой, дзетачкі, за мной, за мной. // Дзетачкі, жаніцеся, за ручкі бярыцеся!»

Дзяўчаты і хлопцы выстройваліся ў рад, адно насупраць аднаго, а «бацькі» злучалі пары. Калі пара была даспадобы, то яна садзілася за стол, калі не, то дзяўчаты ўцякалі, хлопцу ўцякаць не дазвалялася. Падчас гульні пара адзін аднаму спявала прыпеўкі жартоўнага зместу: «Высако арол ліцел, далі мне каго я хацел, // Белаю-румянаю, для мяне каханаю, Белаю-бяленькаю, для мяне міленькаю», // «Смачная рыбачка акунь, скажы, мой дзядулька, адкуль? // Смачная рыбачка карась, пацалуй мяне хоць раз» (па успамінах Я. Вештарт).

З.Я. Мажэйка вылучае «Цярэшкі» як асобны тып зімовых песень, якому характэрны напевы квінтавыя і з танічным устоем пасярэдзіне, напевы больш шырокага дыяпазону з паўторам адной прыпеўкі або з супастаўленнем фраз, сказаў ці больш разгорнутых частак у парадку пытання-адказу [3, с. 7].

На працягу святак ладзяцца вячоркі. Заканчваюцца святкі ў католікаў не чынам вялікага асвячэння вады на Хрышчэнне Гасподне, як у праваслаўных, а святам «Тры крулі», прысвечаным успаміну аб трох валхвах, якія прыйшлі з розных бакоў свету, каб пакланіцца нованароджанаму Хрысту. У гэты апошні дзень святак «адпісваецца» каляда – на сценах усіх хатніх і гаспадарчых пабудоў ставяцца крыжыкі. На «Тры крулі» таксама здзяйсняецца віншавальны абыход двароў, якога няма ў праваслаўных [2, с. 27]. Гэты абрад зафіксаваны як у Рэдзькаўшчыне, так і ў іншых вёсках Пастаўскага раёна. Калі «каралі» ўваходзілі ў хату, адзін з іх заставаўся ў парозе і на дзвярным вушаку крэйдай пісаў тры літары: К М Б – Кацпар, Мацпар, Балтазар. Тыя, хто ўваходзіў у хату, казалі такія словы: «Ці можна зайсці тром каралям?», прасілі дазволу павіншаваць гаспадароў са святам. Цікава, што віншаванне ўвесь час суправаджалася стуканнем палак аб падлогу. Песень не спявалі. Апошні раз апавядальніца бачыла «Трох каралёў» у 1934-1935 гг. (Раіса Мальч, 1924 г.н. г.п. Лынтупы) [2, с. 41-42]. Тое ж апавядала і Гінько Гэлена 1925 г.н. з вёскі Рэдзькаўшчына.

Цікавым з'яўляецца той факт, што абраду каляднага абыходу двароў у Рэдзькаўшчыне не існавала. Ён быў толькі на Вяліканне (па ўспамінах Гэлены Гінько, 1924 г.н). У большасці вёсак Пастаўскага раёна такі абрад існаваў. Гэта зафіксавана ў даследваннях З.Я. Мажэйкі, Г.І.Цітовіча.

Варта адзначыць, што ў вёсцы Рэдзькаўшчына пераважная большасць веруючых католікаў, таму тут можна ўбачыць такія ўзоры песень, дзе традыцыйны (фальклорны) тэкст спяваецца на нетрадыцыйны напеў. Так, напрыклад, традыцыйны тэкст валачобных песен спяваецца на напеў вядомага касцёльнага гімну «Вясёлы дзень для нас настаў», званы ў народзе «Вэсолы». «А на моры гібка кладка, там хадзіла Боска Матка. // Хрыстос Васкрэс, Хрыстос Васкрэс, Хрыстос Васкрэс!» (па ўспамінах Г. Пяркоўскай).

Гэты ж факт адзначаюць Г.А. Барташэвіч і Л.М. Салавей: «У валачобных песнях, апрача знешніх атрыбутаў хрысціянства, можна знайсці некалькі сюжэтаў, магчыма, створаных каляцаркоўнымі коламі. Асобныя з гэтых твораў цалкам фалькларызаваліся і пераказвалі легенду пра смерць Хрыста і яго ўваскрасенне ў адпаведнасці з народнай паэтыкай» [1, с. 20]. На Вяліканне дзяўчатам, якія былі незамужнія, абавязкова спявалі велічальную песню «Чырвоны ружы сад зялёны вішнёвы», ці «А, Клёнічка, Хрыстос!». «А, Клёнічка, Хрыстос! Сын Божы – Хрыстос! // Бель бяліла, Хрыстос! Сын Божы – Хрыстос! // Златы персцень, Хрыстос! Сын Божы – Хрыстос!» (па ўспамінах К. Пачкоўскай).

Г.А. Барташэвіч адзначае, што ў валачобных песнях багатая шлюбная сімволіка. Тут і залатыя кубкі, пярсцёнкі, руцвяныя вянкі, шаўковыя хусткі [1]. Велічальныя песні ў Рэдзькаўшчыне, у адрозненне ад іншых рэгіёнаў, спяваліся толькі на Вяліканне.

Купальскія песні ў вёсцы Рэдзькаўшчына, на жаль, не захаваліся. Але старыя людзі ўспамінаюць звычаі, якія існавалі на Купалле, – распальванне купальскага вогнішча, купальскія варожбы, качанне ў расе, кіданне вянкоў у ваду, шуканне папараць-кветкі. Гэтыя ж абрады былі зафіксаваны фалькларыстамі і ў іншых вёсках Пастаўскага раёна [2, с. 151-155].

Такім чынам, можна сцвярджаць, што ўся каляндарна-абрадавая традыцыя вёскі Рэдзькаўшчына скацэнтравана вакол двух галоўных свят - Каляд і Вялікання. Астатнія ўзоры песень каляндарна-земляробчага цыклу, на жаль, страчаныя, пра іх засталіся толькі ўспаміны.

Наш досвед даследавання сучаснага стану традыцыйнай культуры ў вёсцы Рэдзькаўшчына сведчыць аб тым, што ўзоры традыцыйнай песеннай спадчыны пастунова страчваюцца, таму трэба збіраць і захоўваць іх нават цяпер, бо жыццё людзей змяняецца, і тое, што было характэрна для XIX стагоддзя, захавалася часткова, з'явіліся новыя ўзоры песень. Песні і звычаі рэгіёнаў паступова забываюцца, выцясняюцца радыё і тэлебачаннем. Моладзь мала цікавіцца культурай сваіх вёсак. Песенная культура, якая дагэтуль захавалася ў маленькай вёсцы, служыць прыкладам культурнага жыцця яе жыхароў, адлюстраваннем іх асаблівага светапогляду. І таму галоўная задача сучаснасці – зберагчы яе і перадаць наступным пакаленням.

**Спіс літаратуры:**


1. Барташэвіч, Г. А. Валачобныя песні / Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей ; склад. муз. ч. В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
2. Варфаламеева, Т. Б. Традыцыйная культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т. Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. навука, 2004. – 910 с.
3. Мажэйка, З. Песні Беларускага Паазер'я / З. Мажэйка. – Мінск, 1987.


РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ